**ВАСЮЧЭ́НКА** Пётр Васілевіч (н. 15.2. 1959, г. Полацк), празаік, драматург, літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1985). Скончыў БДУ (1981). У прозе і драматургіі В. адбываецца мадэрнізацыя, вобразнае і канцэптуальнае пераасэнсаванне фалькл. і міфалагічных вобразаў. Кнігі «Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» (1997), «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» (2003) уяўляюць спробу стварэння казачнага эпасу на грунце агульнаславянскай і бел. вуснай нар. творчасці. Персанажы выслоўяў (пан Заблоцкі), нар. песень (дзеўка Дрыпа, Кура-Шчабятура), міфаў (Цмок), батлейкі (цар Максімілян, Адолька, Фіцьмаршал), казак і анекдотаў жывуць у створаным В. хранатопе разам з прыдуманымі аўтарам героямі і тыпажамі. Асваенне фалькл. вобразнасці адбываецца праз шчодрую аўтарскую фантазію, гумар, іронію, гратэск, а канцэптуальнасць і падтэкст робяць казкі В. цікавымі як для дзяцей, так і для дарослых. Літаратурны эксперымент В. закладвае падмурак пад стварэнне нац. фэнтэзі. На фалькл. аснове створаны яго п'есы-казкі «Страшнік Гам» (1994), «Новы Калабок» (1996), «Маленькі збраяносец» (1998), «Хведар Набілкін — беларускі касінер» (1999) і інш. У гэтых творах мадэрнізуюцца і кантамінуюцца вобразы бел. казак пра жывёл, ствараецца тыпаж бел. рыцара (Андрусь, Хведар Набілкін) — барацьбіта са злом, кемлівага, самаіранічнага, цярплівага, цягавітага. Даследуе ўзаемадзеянне фальклору і драматургіі ў манаграфіях «Драматургія і час» (1991), «Драматургічная спадчына Янкі Купалы» (1994), «Сучасная беларуская драматургія» (2000). Разглядае фалькл. генезіс драматычных паэм і п'ес Я.Купалы («Адвечная песня», «Сон на кургане», «Раскіданае гняздо», «Паўлінка», «Тутэйшыя»), развіццё жанру фалькл.-гістарычнай драмы, функцыянаванне ў бел. літаратуры вобразаў-сімвалаў, якія маюць фалькл.-міфалагічнае паходжанне (доля, шлях, кола, карчма, вяселле, крыж, курган і інш.). У навуковых артыкулах В., прысвечаных творчасці Я.Баршчэўскага, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, М.Гарэцкага, В.Ластоўскага, А. Мрыя, У.Караткевіча, В.Казько, А.Дударава і інш., значная ўвага надаецца фалькл.-міфалагічнай вобразнасці.

*Тв.:* Белы мурашнік. Мн., 1993; Пошукі страчанага дзяцінства. Мн., 1995; Славянскі сімвалізм: нацыянальна-адметнае і агульнае. Мн., 1998; Маленькі збраяносец. Мн., 1999.

*У. А. Васілевіч.*

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ